# ФАРМІРАВАННЕ Ў ПАДЛЕТКАЎ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ СРОДКАМІ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ



УДК 37.02:[398.82+7.077](043.3)

**Н. В. ПЕТУХОВА,**
выкладчык кафедры этналогіі і фальклору факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

**Анатацыя**

У дадзеным артыкуле вызначана сутнасць паняцця «эстэтычнае ўспрыманне прыроды», ахарактарызаваны псіхалагічныя асаблівасці яго фарміравання ў падлеткаў, ажыццёўлена характарыстыка фальклору як сродку фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды, прадстаўлены змест фарміравання эстэтычнага ўспрымання падлеткамі прыроды ў працэсе іх арганізаванай дзейнасці ў дзіцячых фальклорных калектывах.

**Ключавыя словы:** эстэтычнае ўспрыманне прыроды, фальклорны калектыў, падлеткі.

**Annotation**

This article defines the essence of the concept of "aesthetic perception of nature", characterizes psychological points of its formation in adolescents, carries characteristic of folklore as a form of aesthetic perception of the nature, represents the content the formation of aesthetic perception of the nature in teenagers during their organized activity in children's folklore ensembles.

**Keywords:** aesthetic nature appreciation, folk group, teenagers.

**Уводзіны**

У сучасным свеце набылі глабальны маштаб экалагічныя праблемы, якія пагражаюць цывілізацыі і шмат у чым прадвызначаюць магчымасці выжывання чалавецтва. Менавіта таму праблема фарміравання экалагічнай культуры, складовай часткай якой з'яўляецца эстэтычнае ўспрыманне прыроды, займае важнае месца ў педагогіцы і патрабуе глыбокага вывучэння не толькі на тэарэтычным узроўні, але і на ўзроўні практычнай арганізацыі работы з дзецьмі.

**Асноўная частка**

Праблема фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды раскрыта ў навуковых працах вядомых філосафаў (Г. З. Апрэсян, Ю. Б. Бораў, А. І. Бураў, П. С. Карака, М. І. Кіяшчанка, К. М. Майер-Абіх, Ю. М. Пахомаў, Й. Сепанмаа, І. Ф. Смальянінаў і інш.), псіхолагаў (Д. Гібсан, Л. М. Рожына, С. Л. Рубінштейн, А. А. Мелік-Пашаеў, З. Н. Наўлянская, Е. М. Таршылава, Г. В. Шэйніс і інш.), класікаў педагогікі (А. Дзістэрвег, Я. А. Каменскі, Дж. Лок, Й. Песталоццы, Ж. Ж. Русо, В. А. Сухамлінскі, К. Д. Ушынскі), сучасных педагогаў (А. Ж. Аўчыннікава, А. А. Вярэм'еў, Л. М. Гафарава, Я. Д. Грыгаровіч, І. Д. Звераў, Н. Р. Купрына, Б. Ц. Ліхачоў, Б. М. Неменскі, А. А. Паловіна, М. В. Раганава, А. П. Сідзелькоўскі, Ю. М. Усаў, А. К. Шульжэнка, І. І. Ярыта і інш.).

Даследаванні вучоных дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што эстэтычнае ўспрыманне прыроды — гэта абумоўлены эстэтычнымі патрэбнасцямі чалавека цэласны працэс адлюстравання аб'ектаў і з'яў прыроднага наваколля, які прыводзіць да пазнання і глыбокага спасціжэння іх эстэтычнай сутнасці.



3. «Сацыяльна-педагагічная работа», № 12, 2011

Пры гэтым прадметам пазнання з'яўляюцца выразныя ўласцівасці прыродных аб'ектаў, іх структура, форма, каляровыя спалучэнні, гукавыя варыяцыі і суправаджаючыя іх эстэтычныя перажыванні, пачуцці рэцыпіента, якія выклікаюць эстэтычную патрэбнасць бескарыснага сузірання прыроды. Педагагічны сэнс фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды заключаны ў развіцці неабыякавага, гуманнага, адказнага стаўлення да прыроды, замацаванні вопыту жыццядзейнасці асобы па законах прыгажосці.

Эстэтычнае ўспрыманне прыроды непарыўна звязана з іншымі катэгорыямі эстэтычнай свядомасці: пачуццямі, ведамі, патрэбнасцямі і інтарэсамі асобы. Яно мае ацэначны характар і залежыць ад наяўнасці ва ўспрымальніка эстэтычнага вопыту, эрудыцыі, эмацыянальнай спагадлівасці, суперажывання. Эстэтычныя пачуцці выступаюць спецыфічнай здольнасцю асобы, дзякуючы якой можна выявіць эстэтычныя ўласцівасці прыроды, адчуць яе прыгажосць, атрымаць эмацыянальнае задавальненне ад яе непасрэднага ўспрымання. У эстэтычных эмоцыях мабілізуецца духоўная энергія чалавека, яны абуджаюць глыбокія эстэтычныя перажыванні, пачуцці радасці, асалоды, якія састаўляюць аснову эстэтычнай патрэбнасці. Эстэтычныя патрэбнасці і інтарэсы праяўляюцца праз зацікаўленасць чалавека ў эстэтычных каштоўнасцях і задавальняюцца праз успрыманне прыгажосці ў прыродзе, творах мастацтва, у справах чалавека. Эстэтычныя патрэбнасці як эмацыянальная і валявая накіраванасць чалавека з'яўляюцца стымулам яго эстэтычнай актыўнасці, якая існуе ў выглядзе ўнутранага імпульсу і сілкуе імкненне да неаднаразовага ўспрымання эстэтычнага аб'екта. Эстэтычнае ўспрыманне абуджае думкі, асацыяцыі ўспрымальніка, у выніку чаго пазнаецца эстэтычная сутнасць прадмета. Пазнанне ўнутранага зместу аб'екта выражаецца ў паняццях, меркаваннях і ацэнках чалавека. Пры гэтым эстэтычная ацэнка ёсць спосаб устанаўлення эстэтычнай каштоўнасці прадмета і ўсвядомлены вынік эстэтычнага ўспрымання.

Абуджаць эстэтычнае ўспрыманне прыроды, вучыць радавацца яе прыгажосці, беражліва і паважліва да яе ставіцца неабходна як мага раней, пачынаючы з дашкольнага ўзросту (Л. М. Гафарава, М. У. Грыбанава, Л. С. Давыдава, А. А. Паловіна, М. В. Раганава і інш.). Аднак навуковыя даследаванні Б. Ц. Ліхачова, Л. П. Пячко, Н. У. Самерсавай, Л. М. Чамаевай, М. В. Шаптухоўскага, Г. У. Шэйніс і інш. сведчаць аб неабходнасці інтэнсіўнага развіцця эстэтычнага ўспрымання прыроды менавіта ў падлеткавым узросце, для якога характэрна крайняя няўстойлівасць эколага-эстэтычнай культуры.

Прадстаўнікі экапсіхапедагогікі С. Д. Дзераба і В. А. Ясвін адзначаюць, што ў падлеткавым узросце адбываюцца кардынальныя змены адносін да прыроды. У прыватнасці, істотна парушаецца і патрабуе карэкцыі ўспрыманне прыроды: знікае ўласцівая дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту суб'ектная ўстаноўка, дзякуючы якой індывід праецыруе на прыродныя аб'екты ўласцівасці чалавека. У выніку чаго прырода ўжо не належыць да самакаштоўнай сферы, роўнай чалавеку, адбываецца рэзкі рост прагматычнах матываў успрымання прыроды, якія суправаджаюцца наіўным уяўленнем, што прыгажосцю можна валодаць як нейкай матэрыяльнай данасцю і распараджацца ёю на свой погляд [1, с. 273]. Больш таго, многія падлеткі праяўляюць жорсткае стаўленне да жывёл і раслін, што звязана з усплёскам агрэсіўнасці, назапашанай з-за псіхалагічных і сацыяльных цяжкасцей дадзенага перыяду. Трэба падкрэсліць, што такія паводзіны часцей за ўсё ўласцівы тым падлеткам, якія маюць нязначны вопыт эстэтычнага ўзаемадзеяння з прыродай. Яны дэманструюць неразвітасць эстэтычнага ўспрымання прыроды, абмяжоўваючы гэты працэс арыентацыяй толькі на «прыгожае — агіднае», якая адказвае бытавому ўзроўню свядомасці, вядзе да падтрымкі варварскага спажывання прыродна-прыгожага і апраўдання знішчэння ўсяго, што лжыва ацэньваецца як прыродна-агіднае.

Дапамагчы падлеткам справіцца з неадэкватнымі паводзінамі можна толькі загадзя, актывізуючы іх эстэтычныя пачуцці да прыроды: ад ідэальна-пазітыўных (узвышанае, прыгожае, гарманічнае, дасканалае і г. д.) да афектыўна-экспрэсіўных (стыхійнае, трагічнае, дысгарманічнае і г. д.), далучаючы да працэсу эстэтычнага сузірання, успрымання, асэнсавання і ацэнкі выразных асаблівасцяў прыродных аб'ектаў і з'яў. Пагаджаючыся з Л. П. Пячко і Н. П. Старасельцавай, неабходна падкрэсліць, што найбольш эфектыўна эстэтычнае ўспрыманне прыроды развіваецца ў пра-

цэсе мэтанакіраванай эстэтычнай дзейнасці, пры стварэнні педагогам разнастайных вучэбна-выхаваўчых сітуацый, арыентаваных на развіццё эмацыянальнай успрымальнасці прыгажосці і выразнасці аб'ектыўных прыродных з'яў, пашырэнне эстэтычных уражанняў падлеткаў, эстэтычных ацэнак, пачуццяў, засваенне грамадскіх ідэалаў, формаў адносін да прыроды. Пры гэтым мэтазгодна прывучаць падлеткаў вылучаць эстэтычныя ўласцівасці прыродных аб'ектаў і з'яў, ацэньваць іх эстэтычныя прыметы, характарызаваць іх эстэтычную каштоўнасць, значэнне для духоўнага самаадчування чалавека. На гэтай падставе ўзнікае ўсвядомленае ўяўленне аб каштоўнасці і прыгажосці прыроды, разуменне недапушчальнасці парушэння яе гармоніі ў індывідуальных паводзінах і прафесійнай дзейнасці [2, с. 61—62].

Дадзеныя вучэбна-выхаваўчыя сітуацыі разглядаюцца намі на прыкладзе дзейнасці дзіцячых фальклорных калектываў, функцыянаванне якіх звязана з аднаўленнем самабытных і непаўторных традыцый беларускага народа, адраджэннем і захаваннем фальклорнай спадчыны. Педагагічны вопыт Г. П. Арловай, В. С. Болбаса, Г. М. Волкава, Л. М. Гафаравай, А. А. Грымаця, С. І. Мургаевай, І. І. Ярыты і інш. сведчыць аб тым, што фальклор з'яўляецца найважнейшым сродкам фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды і гарманізацыі эстэтычных адносін паміж чалавекам і прыродай. Фальклорныя творы абуджаюць у дзяцей цікавасць да прыгожых і таямнічых поглядаў нашых продкаў на прыродны свет, скіроўваюць іх на засваенне эстэтычных традыцый, ідэалаў беларускага народа. Асабліва важным з'яўляецца ўсведамленне выхаванцамі зместу і сэнсу фальклорных твораў, якія фарміруюць уяўленні пра прыгажосць прыроды, выклікаюць глыбокія эстэтычныя пачуцці і перажыванні пры ўспрыманні аб'ектаў прыроднага наваколля. Гэта патрабуе ўдасканалення эстэтычнага аналізу фальклорных твораў, разгляду зместу фальклорнай адзінкі, аналізу яго семантыкі і мастацкіх сродкаў з пазіцыі жанравай адметнасці, ведання асноўных эстэтычных катэгорый (прыгожае — агіднае, узнёслае — нізкае, трагічнае — камічнае) і змешчаных у фальклорных творах эпітэтаў, параўнанняў, метафар і інш., якія ўвасабляюць прыроду, фарміруюць уяўленні пра яе прыгажосць.

Для правядзення заняткаў, прысвечаных фарміраванню эстэтычнага ўспрымання прыроды, мэтазгодна падабраць і сістэматызаваць разнастайны і даступны для вывучэння падлеткамі фальклорны матэрыял у адпаведнасці з наступнымі тэмамі*:

1. «Паэтычныя погляды нашых продкаў на прыроду» (прагляд кінафільмаў З. Я. Мажэйкі «Голоса веков» — Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1979 і «Пранясі, Божа, хмару» — Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1990; расповед народнага жарта «Прыроду не пераможаш» — вёска Бярдовічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці; праслухоўванне і развучванне жніўных песень «Вецяр вея, сонца грэя» — вёска Шутавічы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці, «Перагані, Божа, хмарку» — вёскі Ахонава Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, «А заспорыў Дунай з морам» — вёска Зачэпічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці).

2. «Насякомыя ў беларускім фальклоры» (знаёмства з легендамі «Чаму павука біць нельга (Уцёкі ў Егіпет)» — вёска Бярдовічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці, «Чаму асіна трасецца, зязюля куе, а павука забіваць нельга» — вёска Хрыса Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці, «Адкуль пчолы і пчаліная матка» — вёска Жытомля Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці, «Адкуль шэршні» — вёска Жытомля Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці; казкамі «Казёл і пчала» — вёска Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, «Пчолка і павук» — вёска Рамязы Ельскага раёна Гомельскай вобласці; праслухоўванне песень «Пчолікі гудуць» з рэпертуару гурта «Тройца», «Да раіласа пчолачка» з рэпертуару Н. Матыліцкай).

3. «Шанаванне птушак у беларускай традыцыі» (расповед казак «Певень і жаронцы» — вёска Ізабеліна Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці; легенд «Адкуль зязюля (Непаслухмяныя дзеці)» — вёска Глядавічы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці, «Чаму ластаўка добра гняздо ўе (Птушыны настаўнік)» — вёска Бабічы

* Аснову планавання заняткаў складаюць працы айчыннага даследчыка А. М. Ненадавец, прысвечаныя вывучэнню архаічных поглядаў беларускага народа на прыродны свет:

1. *Ненадавец, А. М.* Каму пакланяліся продкі / А. М. Ненадавец; навук. рэд. А. С. Фядосік. — Мінск : Навука і тэхніка, 1996. — 239 с.

2. *Ненадавец, А. М.* Стварэнне Сусвету (Зямлі) паводле беларускай міфалогіі / А. М. Ненадавец // Міфалогія. Духоўныя вершы / пад рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Беларуская навука, 2003. — С. 13—49.

Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, «Адкуль бусел і кот» — вёска Байкі Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці, «Адкуль жаваранак» — вёска Варанілавічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, «Буслы з Адама і Евы» — вёска Погіры Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, «Чаму вераб'ёў крыўдзіць нельга» — вёска Войстам Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці; слуханне песень «Да была ў бабкі курка-рабушка» з рэпертуару гурта «Юр'я», «Арёл божья пташка» з рэпертуару Н. Матыліцкай; развучванне веснавой песні «Ой чырачка-пташэчка» — вёска Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці і валачобнай песні «Да была ў бабкі курка рабенька» — вёска Студзераўшчына Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці).

4. «Жывёльны свет у міфалагічнай свядомасці нашых продкаў» (расповед легенд «Чаму сабакі і каты адзін аднаго не любяць» — вёска Рэдзігерава Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, «Чаму конь ніколі не пад'есць, а каровам і авечкам можна асвечанае даваць» — вёска Мачуль Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, «Чаму карове асвечанае можна даваць» — вёска Камяно Вілейскага раёна Мінскай вобласці, «Чаму павука, сабаку і ката нельга біць, а елку ўпрыгожваюць» — вёска Ялова Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці; знаёмства з казкамі пра жывёл «Пра ката, лісіцу, ваўка і мядзведзя» — вёска Баркалабава Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці, «Каза-дзераза» — вёска Баркалабава Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці, «Зайчыкава хатка» — вёска Альхоўка Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці; слуханне песень «Кося, мой кося» з рэпертуару гурта «Тройца», «Чаго лосеньку, чаго сівенькі» з рэпертуару Н. Матыліцкай; развучванне веснавой песні «Вол бушуе, вясну чуе» — вёска Ананчыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці).

5. «Шанаванне зямлі ў традыцыйнай культуры Беларусі» (расповед легенд пра стварэнне свету «Стварэнне зямлі і неба» — вёска Бабічы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, «Стварэнне і канец свету» — вёска Полькавічы Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці; праслухоўванне валачобных песень «Благаславі, маці, вясну заклікаці» — вёска Гарэнічы Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці, «Гаспадарочак, слаўны паночак» — вёска Аношкі Лепельскага раёна Віцебскай вобласці; прагляд кінафільма З. Я. Мажэйкі «Рух зямлі» — Беларусьфільм, ВА «Летапіс», 1999).

6. «Водная стыхія ў міфалогіі Беларусі» (знаёмства з легендамі «Адкуль русалкі» — вёска Мяшэтнікі Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці, «Свіцязянка» — вёска Любанічы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці; казка «Сварлівае балота» — вёска Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці; слуханне песень «На граной нядзеле русалкі сядзелі» з рэпертуару гурта «Юр'я», «Правяду русалку» і «Рэчанька» з рэпертуару гурта «Тройца»; развучванне траецкіх песень «На гранавай нядзелі русалкі сядзелі» — вёска Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці, «Правяду, правяду русалачку да бору» — вёска Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці).

7. «Шанаванне расліннага свету старажытнымі беларусамі» (легенды «Адкуль асіна (Праклятая дачка)» — вёска Ізабеліна Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці, «Чаму асіна трасецца, а пад елку ў час навальніцы хавацца можна (Уцёкі ў Егіпет)» — вёска Маркуны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці, «Чаму калядную елку нельга выкідваць у двор» — вёска Вулька-1 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, «Адкуль кветка півоня» — вёска Стары Шклоў Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці; былічкі «Як папараць-кветка ў хадакі ўпала» — вёска Парэчча Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці; слуханне песень «Яблынь мая» з рэпертуару гурта «Тройца», «Балада пра явар і бярозу» з рэпертуару Н. Матыліцкай; развучванне траецкіх песень «Ой бяроза белая» — вёска Раеўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці, «Ой, у боры сосна» — вёска Ананчыцы Салігорскага раёна Гомельскай вобласці і купальскіх «Чырвоная ружа» — вёска Багатырская Полацкага раёна Віцебскай вобласці, «Чаму барок не званок» — вёска Ухвішча Полацкага раёна Віцебскай вобласці).

8. «Вобраз змяі і вужа ў беларускім фальклоры» (легенды «Чаму змеі распаўсюдзіліся» — вёска Сталюгі Лепельскага раёна Віцебскай вобласці, «Каго Ной не ўзяў у каўчэг» — вёска Вулька-1 Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці, «Чаму вуж на жываце поўзае» — вёска Талькаўцы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці, «Чаму гады па свеце распаўсюдзіліся» — вёска Рог Салігорскага раёна Мінскай вобласці, «Вуж ратуе каўчэг» — вёска Жмурна Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці; казка «Змей-круль і мова жывёл» — вёска Маркуны Астравецка-

га раёна Гродзенскай вобласці, замова «Ад укусу гадзюкі» — вёска Дзяражычы Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці).

Падчас знаёмства з фальклорнымі творамі (казкамі, песнямі, легендамі) неабходна імкнуцца далучыць падлеткаў да свету эстэтычных пачуццяў да прыроды, дапамагчы ім уявіць сабе цудоўныя куточкі нашай Радзімы, выклікаць жаданне ацаніць сілу паэтычных метафар і запомніць найбольш выразныя з іх. Аднак фальклорныя творы прадстаўляюць значную цяжкасць для эстэтычнага аналізу падлеткамі. У сілу адсутнасці пэўнага запасу жыццёвага і эстэтычнага вопыту, эстэтычных ведаў ім не заўсёды ўдаецца зразумець вобразную мову фальклору. Таму перш за ўсё неабходна развіваць устаноўку на эстэтычнае ўспрыманне, якая, на погляд Д. М. Узнадзэ, узнікае ў выніку мэтанакіраванай рознабаковай эстэтычнай дзейнасці [3, с. 171]. Эстэтычная ўстаноўка фарміруецца па меры стасункаў з рознымі творамі народнага мастацтва, пры гэтым кожны новы твор усведамляецца на падставе папярэдніх.

Наяўнасць мастацка-эстэтычных ведаў, здольнасць да суперажывання, эмацыянальная спагадлівасць дазваляюць успрымаць цэласнасць, гармонію прыроднага свету ў яго мастацкім адлюстраванні, нараджаюць складаныя асацыяцыі і аналогіі, сувязі мыслення з аб'ектам пазнання. Суаднясенне мастацкага зместу з непасрэднымі жыццёвымі ўражаннямі, асабістымі назіраннямі дапамагае раскрыць асноўныя светапоглядныя канстанты фальклору, якія адлюстроўваюць узаемаадносіны чалавека з прыродай. Паступовае назапашванне падлеткамі пэўнага запасу эстэтычных ведаў, якія суправаджаюцца эмацыянальна-эстэтычнымі рэакцыямі, падводзіць да якасна новага ўзроўню эстэтычнага аналізу твораў фальклору, на падставе якога фарміруюцца эстэтычныя меркаванні. Эстэтычныя меркаванні характарызуюцца ўменнямі вылучаць і абагульняць мастацка-эстэтычныя асаблівасці фальклорных твораў, вобразна і лагічна абгрунтоўваць свае думкі. Яны раскрываюць ацэнкі твораў народнага мастацтва ўдзельнікамі фальклорных калектываў і сведчаць аб ступені развіцця іх эстэтычных пачуццяў, асацыяцый, ведаў.

## Заключэнне

Такім чынам, фальклор з'яўляецца найважнейшым сродкам фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды. Ён пашырае кола эстэтычных уражанняў і ведаў асобы, узбагачае яе эстэтычны вопыт шляхам ўспрымання і засваення разнастайных твораў народнага мастацтва. Успрыманне і засваенне эстэтычнай інфармацыі, светапоглядных ідэй, заключаных у паэтычным змесце твораў, якія фарміруюць уяўленні пра прыгажосць прыроды, выклікаюць глыбокія эстэтычныя пачуцці і перажыванні пры ўспрыманні аб'ектаў прыроднага наваколля, развіваюць у асобы вобразнае мысленне, дапамагаюць засваенню эстэтычных катэгорый прыгожага і ўзвышанага, высокага і нікчэмнага, добрага і блага, гарманічнага і стыхійнага.

Мэтанакіраванае развіццё эстэтычнага ўспрымання прыроды падлеткамі — удзельнікамі аматарскіх фальклорных калектываў патрабуе ўдасканалення навыкаў эстэтычнага аналізу фальклорных твораў, развіцця іх здольнасці да аргументацыі ўласных эстэтычных меркаванняў, эстэтычнай ацэнкі твораў народнага мастацтва.

### Спіс цытаваных крыніц

1. *Дерябо, С. Д.* Экологическая психология и педагогика / С. Д. Дерябо, В. А. Ясвин. — Ростов н/Д. : Феникс, 1996. — 476 с.

2. *Печко, Л. П.* Эстетические свойства природы и учебно-воспитательный процесс в школе / Л. П. Печко, Н. П. Старосельцева // Экологическое и эстетическое воспитание школьников / под ред. Л. П. Печко. — М. : Педагогика, 1984. — С. 34 — 68.

3. *Узнадзэ, Д. Н.* Психология установки / Д. Н. Узнадзэ. — СПб. : Питер, 2001. — 416 с.

*Паступіў у рэдакцыю 03.10.2011*